РОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 169 (1136) ‖ ПЯТНІЦА, 25-га ліпеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

аданьне саюзнага Наркомзему павінна быць выканана

Яшчэ ў маі месяцы Народны Камісар Земляробства БССР тав. Рацкі зьвярнуўся да комсамолу Беларусі з заклікам уключыцца ў круг сваёй працы па сілоснаму будаўніцтву. Комсамол узяў на сябе абавязак даць рэспубліцы адзін мільён тон сілоснай масы.

З часу абвяшчэньня паходу, праца комсамольскіх ячэек вялася выключна па лініі правядзеньня расшыранай падрыхтоўкі да гэтай працы. Практычным будаўніцтвам сілосных ям і траншэй занімаліся толькі некаторыя ячэйкі, у выніку гэтага,—мы маем зусім нездавальняючы тэмп выкапаньня плянаў сілосіваньня. На 20 ліпеня засілосавана толькі 1493 тоны сілоснай масы з патрэбнага мільёну, што складае зусім нізкі процант выкананьня заданьня, і пагражае зрывам справы сілоснага будаўніцтва.

Сілосны штаб ЦК УсеЛКСМ і Наркомзем СССР з 25-га ліпеня па 5-ае жніўня абвясьціў „усесаюзны сілосны тыдзень“.

Практычнымі мерапрыемствамі ячэек у правядзеньні тыдню могуць быць: організацыя ўдарных брыгад па нарыхтоўцы будаўнічага матар'ялу, капаньню ям і траншэй, уборка і падрыхтоўка сілосных культур, (касьба, рэзка і г. д.) — праводзячы ўсю гэтую працу пры шырокім разгортваньні ўдарніцтва і соцыялістычнага спаборніцтва, як сярод ударных брыгад комсамольскіх ячэек, так і колгасаў і саўгасаў на лепшае выкананьне плянаў сілоснага будаўніцтва.

Вялікую працу павінны правесьці гарадзкія комсамольскія організацыі, дапамагаючы вясковым у правядзеньні працы, прыстасаваўшы да сілоснага тыдню пасылку брыгад гарадзкіх комсамольцаў у дапамогу вясковаму, па рыцьцю сілосных ям, уборкі сілосных культур, рамонту сілосарэзак і г. д. Заключаючы ўмовы соцыялістычнага спаборніцтва на выкананьне вясковымі ячэйкамі плянаў сілоснага будаўніцтва, гарадзкімі—прамфінпляну.

Усе комсамольскія ячэйкі і організацыі павінны зараз узяць на сябе абавязацельства перад X зьездам ЛКСМБ і IX зьездам УсеЛКСМ, выкананьне плянаў па сілосаваньню, працуючы пад лёзунгам „Лепшы падарунак зьездам — поўнае выкананьне плянаў сілоснага будаўніцтва“.

Камітэты і ячэйкі вакол правядзеньня ўсесаюзнага тыдню сілосаваньня павінны скласьці шырокую грамадзкую думку, давёўшы аб яе задачах да кожнага колгаса і вёскі, організаваўшы працу так, каб апошні яе адчуваў ня толькі на размовах, але і на практычнай справе, а гэта мы можам зрабіць тады, калі тыдзень сілосаваньня **зьявіцца тыднем поўнага выкананьня плянаў сілосаваньня.**

Удзел комсамолу ў ліквідацыі акруг

Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб мерапрыемствах па ажыцьцяўленьню пастановы ЦК УсеКП(б) аб ліквідацыі акруг

1. Прыдаючы вялізарнае значэньне пастанове ЦК УсеКП(б) ад 15-га ліпеня аб ліквідацыі акруг як мерапрыемству, якое максымальна набліжае апарат дзяржаўных і грамадзка-палітычных організацый да мас і умацоўвае нізавыя зьвеньні (раён, сяло),— ЦК УсеЛКСМ абавязвае усе комсамольскія організацыі правесьці шырокую работу па растлумачэньню гэтай пастановы.

2. Ва ўсёй рабоце па ліквідацыі акруг па комсамольскай лініі (парадак ліквідацыі, тэрмін і інш.)—прапанаваць мясцовым камітэтам УсеЛКСМ выходзіць з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15-га ліпеня і з пастановы рэспубліканскіх, краёвых, акруговых і абласных камітэтаў УсеКП(б).

Організацыя УсеЛКСМ павінна аказаць усямерную практычную дапамогу партыйным, савецкім, профсаюзным організацыям у хутчэйшым правядзеньні ліквідацыі акруг і ў перабудове работы краёвых, абласных апаратаў у мэтах сапраўднага набліжэньня да раёну, сяла.

3. Зьмена сеткі і меж існуючых раёнаў па комсамольскай лініі праводзіць толькі ў тым выпадку, калі яны праводзяцца па партыйна-савецкай лініі абавязкова з ведама і дазволу мясцовых парт. органаў. Структуру комсамольскіх організацый будаваць у адпаведнасьці са структурай партыйных організацый.

4. Разьмеркаваньне акруговых работнікаў ускласьці на краёвыя, абласныя камітэты, забясьпечыўшы поўнае замацаваньне на комсамольскай працы ўсіх кіруючых працаўнікоў, якія вызваляюцца з акруг і якія па оуным чынам павінны быць выкарыстаны для ўзмацненьня апаратаў раённых камітэтаў і асноўных вытворчых фабрычна-заводзкіх камітэтаў, саўгасных, і колгасных колектываў. Выкарыстоўваньне кіруючых комсамольскіх працаўнікоў акруг не на раённай працы а па другому назначэньню рабіць толькі ў выключных выпадках і то з дазволу ЦК УсеЛКСМ.

5. Апараты абкомаў, крайкомаў і рэспубліканскіх ЦК павінны быць усяляк узмоцнены, асабліва неабходна якасна ўзмацніць і пашырыць інструктарскі апарат, з такім разьлікам, каб быў забясьпечаны штодзённы інструктаж і дапамога ў рабоце раённых організацый УсеЛКСМ. Да канчатковага афармленьня раённых камітэтаў комсамолу і замацаваньня сувязі іх абкомамі вылучыць па аднаму прадстаўніку ў акруговыя тэхнічныя бюро сувязі, праз якія ажыцьцяўляць усе прадпрыемствы, зьвязаныя з хутчэйшым устанаўленьнем сувязі з раёнамі.

6. У сувязі з ліквідацыяй акруг лічыць немэтазгодным скліканьне акруговых конфэрэнцый комсамолу, выбары дэлегатаў на IX усесаюзны зьезд правесьці на рэспубліканскіх краёвых і абласных конфэрэнцыях УсеЛКСМ.

Прапанаваць усім акруговым камітэтам зрабіць справаздачы аб сваёй рабоце, у важнейшых раёнах і на буйнейшых прадпрыемствах і саўгаскіх колектывах акругі.

7. ЦК УсеЛКСМ падкрэсьлівае, што правядзеньне работы па ліквідацыі акруг павінна пасьці пад кіраўніцтва абкомаў, крайкомаў, справаздачна-перавыбарчай кампаніяй саюзных органаў і работай па падрыхтоўцы да IX усесаюзнага зьезду УсеЛКСМ.

Абавязаць усе абкомы, крайкомы і ЦК комсамолу нацрэспублік, максымальна пасіліць сваю ўвагу да пытаньняў падрыхтоўкі і правядзеньні раённых конфэрэнцый комсамолу.

8. Прапанаваць усім організацыям УсеЛКСМ у сувязі з раёніраваньнем забясьпечыць перабудову піонэрскай організацыі ў суадносінах з перабудовай комсамольскіх організацый. Зьвярнуць увагу ўсіх організацый на неабходнасьць замацаваньня ўсіх піонэр работнікаў акруг на раённай піонэррабоце, недапушчаючы іх перамяшчэньне на агульную і комсамольскую працу.

9. Даручыць арг. інструктарскаму аддзелу ЦК:

а) 20-дзённы тэрмін прапрацаваць пытаньне па перабудове кіраўніцтва апаратаў абласных, краёвых камітэтаў і ЦК нацрэспублік, з такім разьлікам, каб забясьпечыць дыфэрэнцыраванае кіраўніцтва раёнамі (прамысловымі, зернавымі, жывёлагадоўчымі і г. д.). Абавязаць у гэты-ж тэрмін прадставіць свае думкі аб перабудове апаратаў ЦК ЛКСМУ па ночнага Каўказкага крайкому, Іванавазнясенскаму абкому, МК УсеЛКСМ і Ленобкому УсеЛКСМ.

б) прапрацаваць у дзесяцідзённы тэрмін пытаньне аб штатах крайкому, абкомаў і райкомаў.

Тэлеграма аб асеньнім наборы ў ФЗВ

Наркампрацы, ВСНГ усіх союзных рэспублік усім дырэктарам прадпрыемстваў, начальнікам чыгунак, водных басэйнаў, бязрэйкавых шляхоў зносін, ЦК комсамолу ўсіх союзных рэспублік і ўсім профорганізацыям.

«Прапануем усім органам працы сумесна з гаспадарчымі, профсаюзнымі і комсамольскімі організацыямі ў працягу двух першых дзён жніўня адабраць кандыдатаў для накіраваньня іх у школы ФЗВ, падрадкаваўшы іх мэдыцынскаму і профтэхнічнаму адбору. Пасылку ў школы пачаць 1 верасьня і скончыць у месячны тэрмін.

Гаспадарчыя органы абавязаны безадкладна даць біржам працы заяўкі на патрэбную колькасьць падросткаў, забясьпечыўшы іх разьмяшчэньне на школах. Профсаюзы і комсамол павінны мобілізаваць вакол набору шырокую рабочую грамадзкасьць, організаваць у дапамогу набору ўдарныя брыгады, дабіцца шырокага асьвятленьня ходу набору ў друку.

Аддзелы працы абавязаны кожную дэкаду, пачынаючы з 10-га жніўня паведамляць Наркомпрацы рэспублік (копію Наркомпрацы Союза) аб колькасьці асоб, адабраных і накіраваных у школы ФЗВ, а таксама аб прычынах, якія тармозяць гэтую работу.

Паказаньні месцам, даны вамі па правядзеньню гэтых мерапрыемстваў шліце тэлеграфам. Прыміце захады для выкананьня набору поўнасьцю і ў тэрмін.

Народны Комісар Працы СССР—УГЛАНАЎ
ВСНГ СССР—МАНЦАЎ НКШ—ПАДШЫВАЛІН
УсеЦСПС—АЎДЗЕЕВА ЦК УсеЛКСМ—ЯРМАЛАЕЎ

Няхай ведаюць ворагі рабочых

Бэрлін, штабу зьлёту

Дарагія таварышы!

Па віне нямецкага буржуазнага ўраду мы ня маем магчымасьці разам з вамі прысутнічаць на зьлёце. Соцыял-фашыстыя палічылі наш прыезд у Нямеччыну небясьпечным для сябе.

Чатыры мільёны піонэраў Савецкага Саюзу, якія выбралі нас на зьлёт, у адказ на забараненьне нашага ўезду абавязваюцца: **узмацніць свой удзел у соцыялістычным будаўніцтве, правесьці барацьбу за політэхнічную школу, пашырыць і ўзмацніць інтэрнацыянальную сувязь.**

Няхай ведаюць ворагі рабочых, што ніякімі забараненьнямі ня спыніць росту піонэраў ва ўсім сьвеце!

Няхай жыве другі сусьветны зьлёт!

У барацьбе за рабочую справу „заўсёды гатовы“!

Дэлегацыя піонэраў Савецкага Саюзу.

„Пяцігодка—ў чатыры гады“

Падпісваюцца на 2-х месячны заробак

САРАТАЎ, 23. Першыя тры дні папярэдняй падпіскі на пазыку „Пяцігодка—ў чатыры гады“ далі па краю (па няпоўным даным) 429.000 рублёў. Хваля падпіскі з кожным днём нарастае. У цэлым радзе выпадкаў сума падпіскі перавышае двухтыднёвы заработак. У разьмеры месячнага заработку падпісаліся колектывы рабочых Саратаўскага Салікатнага заводу, крайбюро інжынэрна-тэхнічных работнікаў і інш. Большасьць супрацоўнікаў крайпляну падпісалася на двухмесячную зарплату. На Сталінградзкім трактарным заводзе у 4 першых дні падпіскі далі 150.000 рублёў. На вёсцы кампанія па пазыцы разгорнута слаба.

***

АРЦЁМАЎСК, 23. На 22-е ліпеня падпіска па акрузе на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“ складае ужо каля 2.500 рублёў.

Ваенная пагроза і СССР

Шматлікія конфэрэнцыі і балбатня дзеячоў капіталістычных урадаў аб разбраеньні, выгодная шырма, за якой капіталістыя ўзмацнёна ўзбройваюцца і рыхтуюцца да вайны.

Буржуазія свайго галоўнага ворага, зразумела, бачыць у СССР. Зараз вайсковая пагроза Савецкаму Саюзу становіцца з кожным днём мацнейшай. Пасьпяховае выкананьне пяцігодкі, шпаркія тэмпы індустрыялізацыі і колектывізацыі, посьпех справы будаўніцтва соцыялізму ператварае нашу краіну ў крыніцу пастаяннай трывогі капіталістычнага сьвету за сваё існаваньне.

Відочны прыклад нашай пролетарскай рэволюцыі натхняе рэволюцыйны пролетарыят заходніх краін, узьнімае на рэволюцыйную барацьбу сялянскія масы Кітаю, Індыі і іншых калёній і набліжае канец капіталістычнага сьвету.

Зараз у сувязі з гэтымі посьпехамі асабліва энэргічна запрацавалі фашысцкія сілы за мяжою. Нашы бліжэйшыя суседзі (Польшча, Румынія) пры падбухторваньні і па інструкцыях вялікіх дзяржаў рэорганізуюць свае арміі, маючы на ўвазе „прадстаячую вайну на ўсходнім фронце“.

У Фінляндыі нядаўна адбыўся фашысцкі пераварот, які азначае завяршэньне організацыі фашысцкага кола вакол СССР.

Політычная падрыхтоўка да вайны „з бальшавіцкай небясьпекай“ суправаджаецца паўсюду шпаркім узмацненьнем вайсковых узбраеньняў. Лепш за ўсё гэта відаць з вестак аб росьце ваенных бюджэтаў буржуазных краін. Ваенныя бюджэты суседніх з намі дзяржаў у 1923 годзе раўняліся 184 млн. рублёў, у 1926 г.—224 мільёнамі, а ў 1930 годзе—яны даходзяць ужо да 385 мільёнаў рублёў.

У Польшчы тры гады таму назад было 15 вайсковых заводаў, а зараз іх стала—32. Румынія, амаль ня меўшая раней вайсковай прамысловасьці, зараз выпрацоўвае—20-30 тысяч гарматных снарадаў у месяц і можа ў ваенны час давесьці вытворчасьць іх да 100 тысяч у месяц.

Разьвіліся новыя галіны вайсковай тэхнікі зьнішчэньня людзей—хэмія, танкі, авіацыя. Новая ваенная тэхніка будзе адыгрываць бязумоўна большую ролю, чымся гэта было ў час апошняй імпэрыялістычнай вайны.

Мы ніколі, ні на хвіліну не забывалі, што ўся гэтая падрыхтоўка вядзецца перш-на-перш супроць СССР. Наша Чырвоная армія заўсёды была прадметам самых уважлівых клопатаў з боку савецкага ўраду і ўсіх працоўных мас. У канцы мінулага году асобны атрад нашай Чырвонай арміі на Далёкім Усходзе меў магчымасьці праверыць сваю баявую падрыхтоўку. Гэта праверка дала вынік у нашу карысьць.

Конфлікт на К. У. чыгунцы даў магчымасьць праверыць таксама абароназдольнасьць і рэволюцыйны рух працоўных мас усёй нашай краіны. Гэта праверка таксама паказала, што працоўныя масы СССР гатовы абараняць сваю краіну, што яны цьвёрда ведаюць свой рэволюцыйны абавязак і моцна займаюць перадавое месца ў авангардзе нарастаючай сусьветнай рэволюцыі.

Няма сумненьня, што пад кіраўніцтвам партыі, пры падтрыманьні сусьветнага пролетарыяту ў рашаючых бойках мы пераможам. Але дзеля таго, каб перамагаць трэба раней рыхтаваць перамогу і ўмела яе організаваць.

Ян. Новахатны.



Дэлегацыя азэрбайджанскіх піонэраў у БССР

ФІЗКУЛЬТУРНЫ РУХ ЗРАБІЦЬ РУХАМ МІЛЬЁНА

Усю фізкультурную работу і кіраўніцтва ёю пад абстрэл пролетарскай самакрытыкі

Уцягваючы шырокія масы на правядзеньне самаправеркі фізкультурнага руху на Беларусі,—зробім фізкультурны рух—рухам за палапшэньне працы і быту, за павышэньне тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, за рэалізацыю рашэньняў XVI партыйнага зьезду, за выкананьне „пяцігодкі—у чатыры гады“.

Усю фізкультурную працу і кіраўніцтва пад агонь самакрытыкі і пролетарскі кантроль

Фізкультурны рух ва ўмовах дыктатуры пролетарыяту набывае вялізарнае значэньне і патрабуе чоткай клясавай установкі ў кіраўніцтва ім, барацьбы з тэндэнцыйным тлумачэньнем фізычнай культуры, як вузка-біолёгічнага фактару (забавы і г. д.) з праяўленьнем профэсыяналізму ва ўсіх яго формах (чэмпіёнства, аполітычнасьці), таму што ўсё гэта адрывае фізкультурны рух ад клясавых задач пролетарыяту.

Рашэньні партыі далі магчымасьць устанавіць адзінае цэнтралізаванае дзяржаўнае кіраўніцтва фізкультурным рухам, як у грамадзкіх так і дзяржаўных організацыях, праз саветы фізычнай культуры. Гэта рашэньне дало магчымасьць прыцягнуць да кіраўніцтва фізкультурным рухам шырокія масы фізкультурнікаў, узьняць актыўнасьць і ініцыятыву мас. Гэта самадзейнічала павышэньню самакрытыкі ва ўсёй практыцы фізкультурнай работы.

З часу вынясеньня рашэньняў ЦК УсеКП(б) прайшло больш 8 месяцаў. Тэрмін дастаковы, каб праверыць ці перабудаваны формы і мэтады фізкультурнай работы.

Зрабіць самаправерку—рухам фізкультурнікаў, за перабудаваньне працы

Вышэйшы савет фізычнай культуры Беларусі вынес пастанову з 25 **ліпеня па 25 жніўня па ўсёй Беларусі правесьці месячнік самаправеркі выкананьня дагавору соцыялістычнага спаборніцтва паміж фізкультурнікамі Беларусі і Заходняй вобласьці.**

Самаправерка павінна зьявіцца масавым грамадзкім мерапрыемствам, якое дасьць магчымасьць праверыць, што зроблена ў перабудове фізкультурнага руху і на падставе вывучэньня вопыту, лепшых вузораў працы мобілізаваць шырокія масы фізкультурнікаў на зьнішчэньне маючыхся недахопаў і хутчэйшай перабудовы ўсёй фізкультурай работы.

Самаправерка павінна паказаць, наколькі фізкультурны рух сапраўды перабудоўваецца да максымальнага набліжэньня яго да вытворча-бытавых умоў жыцьця рабочых, набліжэньня гуртковай і масавай працы да цэху, агульна-жыцьця, казармы. Праверыць наколькі фізкультурнік зьяўляецца прыкладам ва вытворчасьці. Наколькі ўся фізычная культура падпарадкавана задачам выкананьня промфінпляну і зьяўляецца рычагом організацыі мас фізкультурнікаў і рабочых навакол задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Самаправеркай патрэбна прагледзець наколькі фізычная культура ў Беларусі справілася з выкананьнем рашэньняў партыі аб прыцягненьні фізкультурных мас да справы колектывізацыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі. Наколькі выкананы кантрольныя лічбы ў галіне шырокага разгортваньня фізкультурнай працы ў колгасах, савгасах (ахопу ФК 100% савгасаў і 30 проц. колгасаў) падпарадкаваньня зьместу фізкультурнай працы і ня толькі агітацыйна-растлумачальным мэтадам, але і аказаньнем практычнай дапамогі ў павышэньні тэмпаў рэконструкцыі сельскай гаспадаркі ударнай работы па правядзеньню вясновай пасеў-кампаніі, набыцьцё сродкаў на трактарную калёну імя „Фізкультурнік Беларусі“, выкананьня лёзунгу „**Кожны гарадзкі фізкультурнік шэфствуе над вясковым** і умацаваньня пролетарскага кіраўніцтва гораду фізкультурным рухам на вёсцы.

Падыходзячы да разгортваньня працы па самаправерцы нельга не адзначыць, што ў шэрагу месц ужо выявіліся хваробныя бакі фізкультурнага руху, на што мы павінны ў часе самаправеркі зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Гэтыя слабыя месцы выявіліся ў дрэннай пастаноўцы грамадзка-выхаваўчай працы сярод фізкультурнікаў, пераважнасьць спортыўна-тэхнічных элемэнтаў над грамадзка-політычнай работай, што вядзе да аполітычнасьці, рэкордсмэнству і іншых хваробных зьявішчаў у фізкультурным руху.

Змагацца з дробна-буржуазным уплывам

Рашэньнем партыі па гэтаму пытаньню дана вычэрпываючая ўстаноўка, выкананьне якой патрабавала перабудовы фізкультурнага руху, палапшэньньня політыка-выхаваўчай работы сярод фізкультурнікаў і правядзеньня няпрымірымай барацьбы з праявамі дробна-буржуазных спортыўных уплываў з боку варожых нам элемэнтаў. Умацаваньне комсамольскага кіраўніцтва з тым, каб фізкультурны рух стаў сапраўдным рэзэрвам папаўненьня шэрагаў комсамолу і адпавядаў задачам пастаўленым партыяй. Гэтае пытаньне ў самаправерцы павінна заняць адно з галоўных месц, а таксама і пункт соцыялістычнага спаборніцтва, што Беларусь павінна на працягу 1930 г. падрыхтаваць новыя пролетарскія кадры інструктароў фізычнай культуры на 700 чалавек, узьняць ідэёва політычны ўзровень і ачысьціць іх шэрагі ад соцыяльна-варожых элемэнтаў прыцягваючых фізкультурны рух да дробна-буржуазнай спортыўнай ідэолёгіі, што нясумясьціма з задачамі савецкага фізкульт-руху.

Ня гледзячы на тыя посьпехі, якія маюцца ў галіне падрыхтоўкі новых кадраў праз акруговыя курсы, мы ўсё яшчэ ня можам цалкам задаволіць падрыхтаванымі кіраўнікамі шырока-разгортваючыйся фізкультурны рух, які так шырока разгортваецца як у горадзе так і ў вёсцы. Самаправерка павінна зрабіць значны пералом у бок павялічэньня тэмпаў падрыхтоўкі пролетарскіх кадраў інструктароў фізкультуры організатараў масавай фізкультурнай працы на прадпрыемстве, у цэху, у колгасе у вёсцы.

На службу масавай падрыхтоўкі мас на абарону Савецкага Саюзу

Нарэшце, самаправерка фізкультурнай працы павінна выявіць наколькі практыка фізкультурнай работы падпарадкавана задачам масавай падрыхтоўкі працоўных да абароны Савецкага Саюзу наколькі програмы, формы і мэтады працы фізычнай культуры ўвязаны з сыстэмай масавай і вайсковай падрыхтоўкай, у прыватнасьці з ТСА-Авіяхэмаўскай работай і як выконваюцца кантрольныя лічбы 100 проц. ахопу фізкультурнікаў ТСА-Авіахэмам і вайскова-стралковымі гурткамі.

Акрамя ўсіх пералічаных мерапрыемстваў, павінны знайсьці адлюстраваньне пытаньні паляпшэньня спортыўна-тэхнічнай працы, інтэрнацыянальнае выхаваньне працы сярод дзяцей і г. д

Выканаць пастаўленыя задачы перад самаправеркай мы зможам толькі ў тых умовах, калі да гэтай працы на падставе разгортваньня шырокай крытыкі і самакрытыкі, будуць прыцягнуты самыя шырокія пласты фізкультурнікаў, праз стварэньне агляду фізкультурных брыгад, сходаў, вечароў і г. д. і пры ўмове забясьпечаньня актыўнага ўдзелу і кіраўніцтва з боку комсамолу профэсыянальных і іншых грамадзкіх організацый Беларусі.

Трэсноўскі.

У Барысаве толькі гаварылі

аб новых формах і мэтадах фізкультурнай працы

Забытым фронтам на Барысаўшчыне зьяўляецца фізкультурны рух. Нават у горадзе фізкультурныя пляцоўкі пазарасьлі травою і ніхто за імі не даглядае. Гурткі фізкультуры амаль не працуюць, замест росту шэрагаў фізкультурнікаў наглядаецца зьменшэньне апошніх.

Яшчэ горш абстаіць справа з абслугоўваньнем фізкультурнай працы рабочых і рабочай моладзі на фабрыках і заводах, дзе зусім не адчуваецца хоць крыху прыкметнай работы па фізычнаму выхаваньню моладзі.

Многа гаварылі аб новых формах работы фізкультуры ў комсамольскай організацыі, але справай сапраўднага перабудаваньня фізкультурнай работы, справы набліжэньня яе да фабрык і заводаў ніхто не займаецца.

В. Мэбель.



Бюро гурткоў абралі, а кіраўніцтва на справе засталося па-старому.

Організаваць масавы рух за перабудову форм і мэтадаў фізкультурнай працы

(З пастановы ВСФК Беларусі)

1. З 25 ліпеня па 25 жніўня па ўсёй Беларусі правесьці месячнік самаправеркі па выкананьню ўмовы аб соцыялістычным спаборніцтве з фізкультурнікамі Заходняй вобласьці, правёўшы апошнюю, як масавую грамадзкую кампанію па агляду ходу перабудовы форм і зьместу фізкультурнага руху паводле дырэктыў партыі і ўраду, і мобілізацыі грамадзкай думкі мас фізкультурнікаў і працоўных на зьнішчэньне маючыхся недахопаў у працы.

2. Прапанаваць акруговым і раённым саветам фізкультуры пры профсаюзах забясьпечыць кіраўніцтва самаправеркай, організаваўшы аглядавыя камісіі пры саветах, профсаюзах фізкульт. брыгады на прадпрыемствах, савгасах, колгасах, прыцягнуўшы у працу апошніх шырокія масы фізкультурнага актыву і прадстаўнікоў профсаюзу, комсамолу, ТСА-Авіяхіму і інш. Праводзячы сходы, нарады, вечары з шырокім абгаварэньнем становішча фізкульт работы і задач самаправеркі прыцягнуць да практычнага ўдзелу самі шырокія масы фізкультурнікаў і працоўных.

3. У правядзеньні працы па самаправерцы карыстацца пастановаю ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ, ураду, УсеЦСПС, дагаварам аб соцспаборніцтве з Заходняй вобласьцю, рашэньнямі Усебеларускай нарады і пленуму ВСФКБ і Усебеларускай міжсаюзнай конфэрэнцыі па фізкультуры

4. Прасіць рэдакцыю газэты „Чырвонай Зьмены“, „Рабочий“ і „Профрух“ шырока асьвятляць працу па самаправерцы.

5. Склікаць у верасьні месяцы Усебеларускую нараду фізкультуры для падвядзеньня вынікаў самаправеркі.

Фізкультура не павярнулася тварам да вытворчасьці

Замест масавай фізкультурнай працы—чэмпіёнства

Зусім не адчуваецца фізкультурнага руху ў нас на фабрыцы „Пролетарская перамога“ (б. „Чырвоная Бярэзіна“). З 1400 чалавек рабочай моладзі па сьпіску гурткоў фізкультуры лічацца ўцягнутымі ў працу 265 чалавек, але гэта толькі па сьпіску, а ў сапраўднасьці маецца дзьве штатныя футбольныя каманды, якія лічацца вечнымі чэмпіёнамі, а сапраўды масавай фізкультуры на фабрыцы няма.

Дарослыя рабочыя зусім ня ўцягнуты ў працу фізкультурных гурткоў, ды і ніхто не праводзіць ніякай працы, каб фізкультурны рух наблізіць да фабрыкі, да цэху, да рабочага. Фізкультура не павярнулася тварам да вытворчасьці.

Нарэшце патрэбна адзначыць, што на фізкультурны рух не звяртаецца ніякай увагі з боку партыйна-комсамольскай і профорганізацыі, якія ня цікавяцца становішчам працы і ня кіруюць ім.

Розэмблюм.

Гаворыцца па-новаму, а працуецца па-старо

Фізкультурнікі ня выканалі ўзятых абавязацельстваў

Выбарамі на конфэрэнцыях кіруючых фізкультурных органаў быў пакладзен пачатак новай структуры фізкультурнай працы разьлічанай на разьвіцьцё самадзейнасьці, добраахвотнасьці і самай шырокай дэмократыі.

У пастановах конфэрэнцыі былі даны зусім яскравыя і вычэрпваючыя паказаньні аб задачах у грамадзка-політычнай працы гурткоў фізкультуры і разгортваньня паміж імі соцыялістычнага спаборніцтва па лініі масавага ахопу рабочых фізкультурай, актыўнага ўдзелу фізкультурнікаў у выкананьні вытворчых плянаў прамысловасьці, шэфства над вёскай і г. д.

Гэта патрабавала ад кожнага фізкультурніка непасрэднай зацікаўленасьці і практычнага ўдзелу ў выкананьні пастаноў, актыўна садзейнічаць іх практычнаму ажыцьцяўленьню на падставе шырокага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі недахопаў у працы, інакш немагчыма было-б правесьці сапраўдную перабудову фізкультурнага руху.

Што-ж мы маем зараз пасьля таго, як амаль прашло 6 месяцаў з часу ўзяцьця фізкультурнікамі на сябе гэтых абавязкаў? Як кіруюць выбарныя, кіруючыя фізкультурныя органы? Якія конкрэтныя дасягненьні маюцца ў сэнсе перабудовы зьместу і мэтадаў работы фізкультуры і пашырэньня масавай фізкультурнай работы? На гэтыя запытаньні трэба адказаць проста: фізкультурнікі ня выканалі ўзятых на сябе абавязкаў.

Каб падцьвердзіць гэта дастаткова адзначыць, што абраныя на конфэрэнцыях бюро фізкультуры пры ЦП саюзу Харчавікоў, Хімікаў, СГЛР, Нарсувязі і Працасьветы фактычна ня існуюць, як кіруючыя органы і нічым не праявілі сябе на практычнай рабоце.

У большасьці бюро ФК астатніх союзаў працуюць толькі адзінкі, якія цягнуць на сябе ўсю работу бюро.

За 6 месяцаў працы з часу пасьля конфэрэнцыі па Менску ў 5 гуртках фізкультуры распушчаны бюро за бязьдзейнасьць.

Рост ліку фізкультурнікаў зусім нязначны, а ў некаторых саюзах зусім няма.

Па союзу Друкароў і Савгандльслужачых з-за адсеву і адсутнасьці росту,—лік фізкультурнікаў паменшыўся.

Ніводзін з гурткоў фізкультуры не праверыў ходу выкананьня заключаных умоў соц. спаборніцтва і г. д.

Побач з гэтым патрэбна адзначыць, што з боку асобных комсамольскіх організацый ёсьць жаданьне займацца фізкультурнымі пытаньнямі, дапамагаць і кіраваць працай фізкультуры.

Усё гэта з усёй настойлівасьцю патрабуе ад комсамольскіх organізацый прыняцьця тэрміновых захадаў для наладжаньня працы фізкультуры і сапраўднага перабудаваньня зьместу працы фізкультуры.

У бліжэйшы час пачынаецца масавая самаправерка становішча працы фізкультурнай організацыі, задача ўсіх фізкультурнікаў і ў першую чаргу фізкультурнікаў Менску выступіць на ліквідацыю прарываў, а комсамол павінен стаць на чале гэтага паходу і ўключыць яго ў сыстэму самаправеркі комсамольскай організацыі.

27-га ліпеня бюро фізкультуры ЦСПСБ, разам з Менскім АК комсамолу склікае гарадзкую міжсаюзную конфэрэнцыю фізкультурнікаў. Патрэбна, каб кожны дэлегат зьявіўся на конфэрэнцыю з конкрэтнымі матэр'яламі, якія будуць адлюстроўваць работу гурткоў, высьвятляць карэньні недахопаў на шляху разгортваньня шырокай крытыкі

З фронту ўборкі ўраджаю

Уборачная—у поўным разгары

...а палёх социялістычнага земляробства, пад знакам социялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва разгортваецца бальшавіцкая ўборка ўраджаю

Ударнае і арганізаванае правядзеньне ўборачнай—выклікала масавы прыліў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у колгасы

Ударныя комсамольскія брыгады дапамагаюць колгасам ва ўборцы

Комсамольская ячэйка в. Жылічы Бабруйскага р-ну на...рэдадні ўборачнай кампаніі абвясьціла сябе ўдарнай. Ком...мольцы разьбіты на брыгады, якія прымацаваны да кол...саў „Сталіна“, „Шлях Ленінізму“ і „Чырвоны Працаўнік“. ...омсамольцы адмовіліся ад выхадных дзён, а замест іх ...ацуюць у колгасах.

Брыгада, прымацованая да колгасу Сталіна, выкапала адну ...осную яму і дапамагла ўбраць сена. У колгасе „Чырвоны ...рацаўнік“ комсамольцы памаглі таксама выкапаць сілосную ...у і ўбраць сена. У колгасе „Шлях Ленінізму“ комсамоль...ая брыгада дапамагла ўбраць сена і часткова збожжа.

Герман В.

...ыкл к „Чырвонай Зьмены“ не пачулі

...Сьмілавіцкі райком комсамолу ...еншчына) не пачуў выкліку ...ырвонай Зьмены“ аб арганізацыі ...эту па пытаньнях падрыхтоўкі ... ўборачнай і асеньня-пасяўной ...паніі, сілосаваньні і сьвінага...улі. Райштаб „ЛК“ злачынна ...зьдзейнічае, атрады „Лёгкай ...валерыі“ нічога ня робяць.

...Рыгор Малаток.

Ад рэдакцыі:—Ня гледзячы на ...днаразовыя сыгналы нашай газэ...ы аб дрэнным становішчы ў Сьмі...віцкай раённай арганізацыі, рай...м комсамолу да гэтага часу зла...нны маўчыць і аб тым, што ім ...нята па юнкораўскаму матар'...у. Мы патрабуем адказу.

Плешчаніцкі раён не гатоў да ўборкі

Падрыхтоўчая работа да ўборачнай кампаніі па Плешчаніцкаму раёну (Меншчына) праходзіць незадавальняюча.

Райколгассаюз да сёньняшняга дню не паклапаціўся **завесьці у раён уборачных машын і нават сярпоў.** Па колгасах да сёньняшняга дню не адрамантаваны машыны. Ураджай з дню на дзень чакае ўборкі. Жыта ў некаторых мясцох пачынае абсыпацца. Шэфствуючыя організацыя Менску павінны як найхутчэй выслаць рамонтныя брыгады, якія-б дапамаглі ў правядзеньні ўборачнай кампаніі ў раёне.

М. ЕНЫШ.

Будаўнікі выклікаюць

Агульны сход рабочых будаўнікоў м. Сьвіслачы абвясьціў сябе ўдарным для дапамогі ў правядзеньні ўборачнай і асеньня-пасяўной кампаніі ў раёне. Складзена 6 брыгад, у кожнай з іх па 4-3 дзесяткі людзей, якія кінуты ў колгасы раёну.

Мы выклікаем астатніх профэсыйных і саматужных організацый раёну пасьледаваць нашаму прыкладу.

Юнкор Баршай.

Пачалася ўборка жыта

З вялікім уздымам праходзіць касьба ў колгасе „Новы Шлях“, (Сьмілавіцкага раёну). Ужо скошана палова сенажаці. Гэтымі днямі пачалася ўборка жыта.

Р. М.

Не на чале мас, а ў хвасьце

Уборачная кампанія ў колгасе „Рэволюцыйны выбух“, Глускага раёну (Бабруйшчына) распачалася своечасова. Ужо больш паловы сенажаці сабралі. Сельгасмашыны выкарыстоўваюцца з поўнай нагрузкай. Так, жнеярка якая павінна скасіць 4 га ў дзень, скошывала **5 з паловай.** Разгорнута будаўніцтва аборы для кароў. Вядзецца падрыхтоўчая работа для пабудовы сьвінарніка. У рабоце па ўборцы адсутнічае соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, вытворчых нарад пры колгасе няма. Культмасавая праца адсутнічае. Мястэчковая ячэйка на дапамогу колгасу вылучыла 16 чалавек. Комсамольская ячэйка колгасу бязьдзейнічае і не стала застрэльшчыкам у разгортваньні ўдарніцтва сярод калгасьнікаў.

Р. Бэдынерман.



Пачалося жніво

СЁНЬНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА „УСЕСАЮЗНЫ ТЫДЗЕНЬ СІЛОСАВАНЬНЯ“

1.000.000 тон сілоснай масы—лепшы падарунак X-му зьезду ЛКСМБ і IX-му зьезду УсеЛКСМ

Неадкладна мобілізаваць масы на баявую задачу сёньняшняга дню!

Наркамзем „нажымае“

Комсамольскія організацыі Віцебскай акругі горача адклікнуліся на заклік Наркамзему СССР—пабудаваць сіламі комсамолу 1 мільён сілосных ям і траншэй.

Ячэйкі (Межа, Бешанковічы) распачалі працу па ажыцьцяўленьню рашэньняў ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ па пабудове сілосных ям.

Але ў правядзеньні гэтай работы мэецца шэраг хныканьняў асобных комсамольцаў і работнікаў райкому, якія гавораць аб тым, што заданьне Наркомзему і ЦК ЛКСМБ нерэальныя і г. д.

А яшчэ „лепш“ выразіў сваю думку адказны работнік—намесьнік загадчыка старшыні Віцебскага Акрвыканкому тав. Сапрыцкі, які сказаў:—Мы сілосуем усю акругу аж да комсамолу. І далей падкрэсьліў: „Мы нарыхтуем сілос, а дзе яго дзенем (!?). І калі запыталі ў Сапрыцкага:—чаму ён падпісваў паказаньні райкомам, калі ён сумняваўся у нерэальнасьці дадзенага мерапрыемства, дык ён адказаў:—**„Я падпісаў таму, што Наркомзем нажымае“.**

Комсамол павінен рашуча ударыць па настроях маркі Сапрыцкага, якія існуюць у раёнах Віцебшчыны.

Сілос.

Бязьдзейнасьць пагражае зрывам

У шмат якіх сельсаветах Касьцюковіцкага раёну, Магілеўскай акругі комсамольскія ячэйкі і колгасы ня прыступілі да будаўніцтва сілосных ям. К прыкладу возьмем Макрынскі сельсавет, у якім дзякуючы бязьдзейнасьці комсамольскай ячэйкі і сельсавету ня выкапана ніводнай сілоснай ямы. Райком комсамолу і партыі, Райколгассаюз бязьдзейнічаюць. Ніякія паказаньні колгасам і комсамольскім ячэйкам не дадзены. Справе сілосаваньня пагражае зрыў.

Сяднёў.

Ячэйка слабая, таму і працаваць ня будзем

Комсамольская ячэйка колгасу „10-годзьдзе Кастрычніка“ Стара-Дарожскага раёну ніякай работы па сілосаваньню яшчэ не распачала. Калі на сходзе ячэйкі беспартыйны хлапец унёс прапанову, каб ячэйка ўзялася за працу па сілосаваньню, дык сакратар ячэйкі і астатнія комсамольцы выступілі супроць гэтай прапановы матывіруючы тым, што ячэйка слабая і непрацаздольная. Іншыя ячэйкі раёну таксама нічога ня робяць па сілосаваньню. РК комсамолу гэтай працай ня кіруе.

Юнвяскор.

У нас няма цыркуляраў

Колгас імя „16 партызан“ м. Дукора да гэтага часу ніякай работы па сілосаваньню не праводзіць. На запытаньне ў старшыні колгасу:—ШТО колгас зрабіў у справе сілосаваньня апошні адказвае: Няма яшчэ цыркуляраў з Райколгассоюзу, таму нічога ня робім!

Комсамольская ячэйка м. Дукоры таксама чакае цыркуляраў ад райкому комсамолу. Комсамолец, які скончыў курсы па сілосаваньню ніякую работу па сілосаваньню яшчэ не пачаў „Чаго сьпяшацца з козамі на торг“,—адказваюць комсамольцы на іх бязьдзейнасьць у справе капаньня сілосных ям.

Ц. Лявіцкі.

Сяўбу па-бальшавіцку правялі, а ўборачную сустракаюць па-абломаўскі

Колгас „Пабеда“, Лепельскага ра...у (Полаччына) па-бальшавіцку за...чыў вясеньні сеў, выканаўшы ...сеўны плян на 117 проц.

Да уборачнай-жа кампаніі разгор...аецца **вельмі слаба.** Гумны для ...аданьня сена і збожжа не пабу...ваны. Машыны не адрамантаваны.

Дрэнна абстаіць справа і з падрыхтоўкай да асеньняга севу: да гэтага часу ня ўзораны паравы клін і невядома калі ўзарэм. Комсамольская ячэйка колгасу стаіць у баку ад гэтых важнейшых гаспадарча-палітычных задач

В. Багрэц.

...борку закончылі своечасова

Комуна „Авангард“ Калінкавіцкага ...ёну (Мазыршчына) гэтымі днямі **...кончыла ўборачную кампанію.** ...аль палова ўраджаю зьвезена з ...оля.

У часе ўборачнай кампаніі шы...ка было разгорнута социялістыч...е спаборніцтва і ўдарніцтва, дзя...ючы чаму ўборка прашла з вя...кім посьпехам.

Зараз комуна пачала будаваць ...вінарнік, разьлічаны **на 90 сьві...аматак.**

Кузьмінок, Радзько.

Організаваная ўборка выклікала прыліў у колгасы.

Колгас „Новыя Халоднікі“, Дамановіцкага сельсавету ва ўсеўзброеньні сустрэў уборачную кампанію. Праца па ўборцы ідзе пляново без перабояў. Сярод колгасьнікаў разгорнута социялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. У сувязі з добрай організацыяй працы па ўборцы ураджаю ў колгас пачаўся прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

А. К. і П. Р.

Аб беднаце забыліся

Дукорскі сельсавет (Меншчына) не ...азвае ніякай дапамогі бядняцкім ...чырвонаармейскім гаспадаркам у ...равядзеньні ўборкі сенажацяй. Сельсавет на звароты беднякоў аб дапамозе ім увесь час адмаўляе і ў выніку ў многіх бядняцкіх гаспадарак сенажаць травяць.

Лявіцкі.



Ударная брыгада колгасьнікаў на касьбе (колгас „Пролетары“ Узьдзенскі раён)

Распачалі працу

Сход комсамольскай ячэйкі колгасу „Маяк Социялізму“ Барысаўскага раёну пастанавіў выкапаць 16 сілосных ям, ёмкасьцю ў 30 кубамэтраў кожная. Кожны дзень на гэтай рабоце працуюць па 5—6 чалавек. Некалькі ям ужо выкапаны і запоўнены сілоснай масай.

В. Мэбель.

Буда-Кашалёўскі райколгассаюз сарваў курсы

Буда-Кашалёўскі райколгассаюз (Гомельшчына) праводзіў курсы па падрыхтоўцы інструктароў сілосаваньня. На вялікі жаль на курсы прыехала толькі 50 проц. вызначаных людзей з тэй прычыны, што райколгассаюз разаслаў паперкі па сельсаветам і колгасам у той час, калі курсы распачалі сваю працу.

Зубкоў.

* *
*

Кулзінская ячэйка ЛКСМБ Бялыніцкага раёну, Магілеўскай акругі абвясьціла сябе ўдарнай па дапамозе колгасам у правядзеньні ўборачнай кампаніі і сіласаваньня.

У колгас „Комінтэрн“ паслана ударная брыгада з пяці комсамольцаў.

Адначасова ячэйка выклікала на соц. спаборніцтва **Шклоўскую ячэйку.**

Падлоў.

Мастацкі агітпроп комсамолу— у Менску

Як арганізаваўся Ленінградзкі Трам

Ці можна лічыць заснаваньне ЛенТРАМ'у выпадковым? Не! А паміж іншым некаторыя „савецкія“ крытыкі і „аматары тэатральнага мастацтва“, якія ня прызнаюць ТРАМ'аўскі рух, цалкам заяўляюць, што Лен. ТРАМ на даляглядзе тэатральнага мастацтва зьявіцца выпадковым.

Калі ЛенТРАМ лічыць выпадковым зьявішчам у нашым жыцьці, дык як-жа лічыць усе астатнія ТРАМ'ы, якія раскінуліся па ўсяму Савецкаму Саюзу?

Ленінградзкі ТРАМ нарадзіўся ў 1921-22 годзе у Доме Комуністычнага выхаваньня імя „Глерона“. Нарадзіўся тады, калі стары тэатр стаяў на раздарожжы, ня ведаючы, што ставіць і як, каб захапіць савецкага гледача. У той час, калі ТРАМ разам з самадзейным мастацтвам стаў уваходзіць у жыцьцё стары тэатр карміў сучаснага гледача старымі клясычнымі ніколькі не хвалюючымі опэрамі, мяшчанскімі пошленькімі опэрэткамі і надта няглыбокімі савецкімі мэлёдрамамі.

Тэатр у той час ня меў рэволюцыйнай драматургіі, тэатр ня меў новых мастацкіх форм і ЛенТРАМ'у разам з самадзейнымі гурткамі прыходзілася выпрацоўваць свой мастацкі мэтад, шукаць новыя мэтады і формы акторскай гульні і г. д.

Бясспрэчна ленТРАМ узяў ад старога тэатру надта многа, бясспрэчна на ТРАМ уплывалі і існуючыя рэволюцыйныя тэатры (Скажам у прыватнасьці тэатр Мэйерхольда), але ТРАМ **ідзе сваімі уласнымі шляхамі, утвараючы новую пабудову спэктаклю, выхоўваючы новага комсамольскага актора, арганізуючы новы соцыялістычны тэатр.**

ТРАМ нарадзіўся ў час абвостранай клясавай барацьбы на бытавым і вытворчым франтох. Усе пастаўленыя спэктаклі адлюстроўвалі так ці інакш гэтую барацьбу.

Якія-ж пытаньні былі пастаўлены у гэтых спэктаклях? Пытаньні: **аб старой і новай сям'і аб антысэмітызьме, аб дзяляцкіх адносінах да вытворчасьці і да жыцьця, аб утварэньні ўдарных брыгад, аб соц. спаборніцтве, аб бюрократызьме, аб колектывізацыі сельскай гаспадаркі і г. д.** і г. д. Вось важнейшыя пытаньні якімі займаўся ТРАМ.

Што-ж вызначае зьмест ТРАМ'у, яго твар? Па-першае яго соцыяльны склад. **Усе працаўнікі ТРАМ'у гэта рабочыя фабрык і заводаў: сьлесары, токары, галошніцы, тэкстылі і г. д.** Усе яны комсамольцы, грамадзкія працаўнікі—гэта перш за усё характэрна для ТРАМ'у, гэтым і тлумачыцца непасрэднасьць і даходчывасьць ТРАМ'аўскіх спэктакляў да гледача.

Па-другое твар ТРАМ'у азначаецца яго тэматыкай, яго вострымі хвалюючымі гледача пытаньнямі. І па-трэцяе—яго мастацкім мэтадам, яго філёзофіяй, філёзофіяй пролетарыяту — дыялектычным матэрыялізмам.

Што-ж арганізуе ТРАМ і якая глеба на якую ён абапіраецца у сваёй рабоце? Па-першае, неразрыўная сувязь з рабочай моладзьдзю, з комсамолам. Для гэтага пры ТРАМ'е арганізаваны Інстытут дэлегатаў, які аб'ядноае хлапцоў з усіх прадпрыемстваў, якія контралююць ТРАМ'аўскую працу, якія ставяць перад ТРАМ'ам шэраг пытаньняў, якімі хвараюць асобныя прадпрыемствы. Акрамя гэтага ТРАМ'аўцы частавыляжджаюць на фабрыкі і заводы, прa-



вяраючы ўдзел моладзі ў вытворчасьці; пасьля спэктакляў арганізоўваюцца дыспуты на якіх рабочая моладзь уносіць прапановы і зьмены пасобным спэктаклям

ТРАМ'аўцы кіруюць ТРАМ'ядрамі на асобных прадпрыемствах, якія ставяць задачу разьвязваць пытаньні мясцовага парадку і г. д.

І самае галоўнае, што арганізуе ТРАМ—гэта агульнажыцьцё. Большасьць працаўнікоў ТРАМ'у жывуць разам, гэтым і азначаецца згуртаванасьць ТРАМ'аўскага організму, гэтым і азначаецца ТРАМ'аўскі спэктаклі, які характэрны колектыўнасьцю, масавымі сцэнамі.

ЛенТРАМ з самага пачатку і да гэтага часу разьвязвае пытаньні пастаўленыя нашай партыяй і комсамолам і будзе ў будучым таксама працаваць стойчы на генэральнай лініі партыі.

ТРАМ, як раней, так і зараз будзе бяз „Галавакружэньня ад посьпехаў“, бяз суму пры цяжкасьцях, будзе дамагацца такіх умоў, у якіх будзе арганізоўвацца і выхоўвацца новы чалавек.

ТРАМ будзе разам з комсамолам будаваць новае жыцьцё, будзе ўтвараць сапраўдны соцыялістычны тэатр і будзе заўсёды апраўдваць сваё названьне—мастацкага агітпропу комсамолу.

Мікола Вінаградаў.

P.S. Ад Ленінградзкага ТРАМ'у рабочай моладзі гор. Менску комсамольскае прывітаньне! М. В.

Агітуюць... а батракоў у комсамол не прыбывае

Мы заўсёды шмат гаворым аб уцягненьні маладога батрака ў комсамол. Гэтыя словы часта выпускаюцца толькі на паветра. Праяжджаючы па раёнах Менскай акругі (Плешчаніцкі, Бягомельскі, Халопеніцкі), меўшы гутарку з батракамі, можна часта пачуць скаргі з іх боку на комсамол. Маюцца ячэйкі, якія налічваюць у сваіх шэрагах толькі па аднаму—два батракі. Заявы батракоў аб прыёме у комсамол па некалькі месяцаў марынуюцца ў сталох і папках ячэяк. Процант батракоў-актывістаў малы, а ў некаторых мясцох зусім няма. Комсамольскія ячэйкі ня ўмеюць падыйсьці да маладога батрака, ня прыслухоўваюцца да яго інтарэсаў і запатрабаваньняў. Райкомы пішуць абежнікі, агітуюць... а батракоў у комсамол не прыбывае.

Неабходна перабудаваць працу вясковай комсамольскай організацыі. Менскаму Акруговаму Камітэту ЛКСМБ трэба праверыць работу сярод ботракоў і пачаць не папяровую, а сапраўдную працу па ўцягненьню маладога батрака ў шэрагі КСМ.

Алесь Вясёлы.

З фронту рабочага забясьпечаньня

„ВАМ ПА НОРМЕ НЕПРАДУГЛЕДЖАНА“

Плян забясьпечаньня сталовак ня выконваецца. Бюрократычныя адпі... кі і агульныя разважаньні аб забясьпечаньні сталовак становіцца с... стэмай работы

Прапановы рабочых па грамадзкаму харчаваньню н... рэалізаваны

Гэтымі днямі адбылася нарада загадчыкаў сталовак МЦРК якая выявіла шэраг адмоўн. фактаў у пытаньні забясьпечаньня сталовых продуктамі і гароднінаю і нядбайныя галавацяпскія адносіны асобных працаўнікоў МЦРК да справы грамадзкага харчаваньня.

АНАРХІЯ У РАЗЬМЕРКАВАНЬНІ ПРАДУКТАЎ ПАМІЖ СТАЛОУКАМІ

Да апошняга часу МЦРК ня мае ніякага пляну забясьпечаньня сталовак продуктамі і гароднінаю. Адносіны складаў МЦРК да гэтай справы бяечынныя. Напрыклад, калі 8-я сталоўка замест патрэбных ёй 5 яшчыкаў капусты атрымлівае 15 яшчыкаў, дык другая зусім капусты не атрымлівае „бо ёй па норме не паложана“—так адказваюць загадчыкі складаў. Адна сталоўка прасіла 5 мяхоў бульбы, а атрымала 50 (?!) і так, як гэта сталоўка ня мела памяшканьня для захаваньня бульбы, дык апошняя на 50 проц сапсавалася.

Часта сталоўкам даюць гнілую нягодную гародніну. Быў выпадак, калі гародніна, здадзеная лаўкамі МЦРК, як нягодная для продажу потым была накіравана ў сталоўку.

Склады вельмі часта практыкуюц так званы „прымусовы асортымэнт“, напрыклад, каб атрымаць цыбулю, абавязкова патрэбна узяць пэўную колькасьць і іншай гародніны, якая ў даны момант зусім не патрэбна сталоўцы.

Гэта **прымушае загадчыкаў сталовак купляць цыбулю і іншую зеляніну ў прыватнікаў.** Разам з гэтым аднойчы у 9-ю сталоўку прыслалі адразу 22 мяхі цыбулі.

Разьмеркаваньне жыроў праводзіцца таксама па прынцыпу: **дзе густа, а дзе пуста,** а сталоўка якая прапускае ад 3 да 5 тысяч наведвальнікаў атрымала 100 кілёграм сала і ў гэты-ж час 3 сталоўка, якая абслугоўвае значна менш наведвальнікаў атрымала 150 кілёграм. Сталоўка пры сельска-гаспадарчай выстаўцы за адзін раз атрымала 51 кілё **зьлівачнага масла, у той** час як рабочыя сталоўкі іншых прадпрыемств ў **масла зусім не атрымалі.**

Культурнай гарбатні ня выдавалі цукру, матывіруючы гэта тым, што пры разьвёрстцы цукру гарбата не была прадугледжана!

Вельмі часта сталоўкі па некалькі гадзін ня маюць хлеба; выключна па віне разьмеркавальнага апарату МЦРК.

САМАТУЖНІКІ З МЦРК

Калі раніцою прайсьці па Віленскаму і Троіцкаму кірмашох, дык можна ўгледзіць вельмі цікавы малюнак. Амаль усе 34 загадчыкі сталовак кожны з сваім бідонам і рамізьнікам (якому плоціць 6-8 руб.) ярасна атакуюць сялян, якія прадаюць сьмятану. Заплаціўшы па 3-4 руб. за літар сьмятаны толькі к 12 гадзінам зьвяртаюцца ў сталоўку. Адсюль вывад: „У МЦРК не хапае малочных прадуктаў. Гэтыя прадукты неабходна купляць на прыватным рынку, дык чаму-ж гэта не зробіць ЦРК арганізавана—аднаму чалавеку? Гэта дало-б тысячу рублёў эканоміі.

Загадчык 8 сталоўкі Бернштэйн заявіў, што па яго сталоўцы за апошні час накладныя выдаткі павялічыліся больш як на 100 проц.

Адкормачныя пункты МЦРК не скарыстоўваюць у сталоўках бульбянае лушпіньне і памыі, што заўсёды застаецца і такі каштоўны для жывёлы корм выкідаецца вон.

ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ АБЕДАЎ

Вельмі дзіўна, чаму гэта ў сталоўках зусім не гатуюцца страва з гародніны? Чаму гэта ў любой сталоўцы Масквы і Ленінграду заўсёды можна дастаць халодную закуску прыгатаваную выключна з гародніны, а ў Менску і днём з агнём нічога ня знойдзеш?

На гэтае пытаньне даў праўдзівы адказ старшыня ЦП саюзу Нархарч т. Злотнікаў, які заявіў, **што пытаньнем гатаваньня страў з гародніны і ягад ніхто яшчэ не займаўся і не цікавіўся.**

Калёрыйнасьць **абедаў ніколі нікім** не правяраецца. Зусім адсутнічае нагляд за якасьцю прадуктаў, паступаючых на склад і са складу ў сталоўку

СКАРАЦІЦЬ ГАНДЛЯРСКІЯ АПЭТЫТЫ

Гэта пытаньне ня можа не хв... ваць рабочую грамадзкасьць. ... вядома, што раней сталоўкі заў... былі дэфіцытнымі. Якім-жа гэта ... нам зараз, калі асабліва ўпарта ... дзецца барацьба за павышэньне ... альнай зарплаты рабочага, ста... даюць дзесяткі тысяч прыбытку? ... ваецца „ларчык проста адчыні... абедзены абонэмэнты аплачва... пайшчыкамі на 42 кап. за абе... абеды выдаваемыя па гэтых тал... каштуюць 25-30 кап. Цэны абеду, ... даваемых касай значна вышэй сапр... най каштоўнасьці абедаў. Вось ту... і закапана сабака.

Гэта справа павінна быць тэрмі... высьветлена камісіяй РСІ, якая ... цуе па рабочаму забясьпечан... **Трэба скараціць гандлярскі ап... МЦРК**

МЫ ПАТРАБУЕМ АД МЦРК

каб былі асобна вызначаны ўсе ... складаў грамадзкага харчаваньня.

— Вылічаны лічбы прапус... здольнасьці сталовых і ўстано... строгае разьмеркаваньне праду... паміж сталоўкамі.

— Разгрузіць загадчыкаў ста... ад непатрэбнай бегатні па скла... даць ім магчымасьць стала зай... справамі сталоўкі.

Правесьці прымацаваньне пай... каў да сталовых у мэтах ліквіда... ня чаргі.

— Талёны для абедаў на дом ... даваць з вечару. Пашырыць ... сталовак, скарыстаўшы для гэтаг... раг пустуючых магазынаў, памяш... не бышай сталоўкі № 2, пусту... памяшканьне пад культурнай га... вай і г. д. Наладзіць бесьпераб... забясьпечаньне ўсіх сталовак хл...

Брыгадзір „Чырвонай Зь...

Н. Мі...

Адказны рэдактар Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 59...